# *§ 40–41–0. Беларусь у еўрапейскіх войнах ранняга Новага часу

**1. Вайна за польскую спадчыну.** Напачатку 30-х гг. XVIII ст. тэрыторыя Рэчы Паспалітай ператварылася ў арэну барацьбы паміж вядучымі краінамі Еўропы. Смерць караля Аўгуста II Моцнага прывяла да канфлікту інтарэсаў Францыі і расійска-аўстрыйскага блока, што сталася пачаткам *Вайны за польскую спадчыну (1733–1738 гг.)*, якая разгарнулася не толькі ў Рэчы Паспалітай, але таксама ў Італіі і Германіі. Гэтая вайна была адным з этапаў барацьбы за гегемонію ў Еўропе паміж Вялікабрытаніяй, Францыяй, Аўстрыяй і Расіяй.

## ПРЭТЭНДЭНТЫ НА ТРОН РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ



*Станіслаў Ляшчынскі. Мастак Жан Жырардэ*



*Фрыдрых Аўгуст II (Аўгуст III). Мастак Луі дэ Сільвестр*

Расійская армія прайшла скрозь тэрыторыю ВКЛ, не сустракаючы супраціўлення, бо значная частка мясцовых магнатаў і шляхты падтрымлівала ў гэтай вайне саюзніка Расіі Аўгуста III. Баявыя

дзеянні разгарнуліся на тэрыторыі Польшчы, аднак яны былі няўдалыя для караля Станіслава Ляшчынскага, які са сваімі прыхільнікамі быў блакаваны ў Гданьску. Нягледзячы на высадку французскага дэсанту, праз чатыры месяцы аблогі ў чэрвені 1734 г. Гданьск здаўся. Кароль Станіслаў Ляшчынскі збег з краіны. Вынікам вайны было ўзмацненне міжнароднага становішча Расіі ў Еўропе і яе ўплыву ў Рэчы Паспалітай. У Заходняй Еўропе вайна прывяла да аслаблення Габсбургаў на карысць Францыі.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, запоўніце табліцу «Вайна за польскую спадчыну».*

| | |
|---|---|
| Дата | |
| Удзельнікі | |
| Прычыны вайны | |
| Нагода | |
| Мірная дамова | |
| Вынікі | |

**2. Сямігадовая вайна.** Супярэчнасці паміж буйны́мі еўрапейскімі дзяржавамі заставаліся дастаткова моцнымі, што прывяло да *Сямігадовай вайны (1756–1763 гг.)*, якая адбывалася не толькі ў Еўропе, але і ў Азіі і Паўночнай Амерыцы. Рэч Паспалітая захоўвала нейтралітэт падчас Сямігадовай вайны, тым не менш яна спачувала Францыі, Аўстрыі і Расіі, прапускала цераз свае землі расійскія войскі. У 1756 г. расійскія войскі праз тэрыторыю Беларусі накіраваліся да прускага тэатра ваенных дзеянняў. Землі ВКЛ і Польшчы аж да 1762 г. заставаліся базай для расійскай арміі ў Сямігадовай вайне. Нягледзячы на тое што на

Растлумачце, чаму Уінстан Чэрчыль называў Сямігадовую вайну «сапраўднай Першай сусветнай вайной».

тэрыторыі Беларусі баявых дзеянняў не адбывалася, вайна аказала негатыўны ўплыў на эканоміку ВКЛ, паспрыяла абясцэньванню грошай, абвастрыла ўнутрыпалітычную барацьбу і аслабіла суверэнітэт Рэчы Паспалітай.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце доказы таго, што Сямігадовая вайна негатыўна адбілася на эканамічным і палітычным развіцці ВКЛ.

**3. Войны з Асманскай імперыяй.** Пашырэнне Асманскай імперыі ў XVI ст. і выхад яе да межаў Рэчы Паспалітай прывялі да абвастрэння ўзаемных супярэчнасцей. Падтрымка Жыгімонтам III аўстрыйскіх Габсбургаў, што загразлі ў Трыццацігадовай вайне, справакавала вайну Асманскай імперыі супраць Рэчы Паспалітай *1620–1621 гг.* Нягледзячы на першапачатковыя няўдачы, у 1621 г. войскі Польшчы і ВКЛ разграмілі туркаў пад Хоцінам, што зрабіла немагчымым захоп асманамі Украіны.

## ВОЙНЫ ПАМІЖ РЭЧЧУ ПАСПАЛІТАЙ І АСМАНСКАЙ ІМПЕРЫЯЙ У XVII СТ.

1620–1621 гг. → 1633–1634 гг. → 1672–1676 гг. → 1683–1699 гг.

У 1633 г. узаемаадносіны паміж абедзвюма дзяржавамі абвастрыліся, што прывяло да вайны *1633–1634 гг.* Улічыўшы, што з пачаткам Смаленскай вайны асноўныя сілы літоўска-польскага войска былі засяроджаны на ўсходзе ВКЛ, асманы ў 1633 г. пачалі новае ўварванне. Аднак пасля заключэння Палянаўскага міру паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй асманы, нічога не дабіўшыся, адступілі.

Крывавыя падзеі 1648–1667 гг. значна аслабілі пазіцыі Рэчы Паспалітай. Украіна апынулася падзеленай на дзве часткі. Спроба гетмана Правабярэжнай Украіны пры падтрымцы асманаў аддаліцца ад Польшчы выклікала вайну Асманскай імперыі супраць Рэчы Паспалітай *1672–1676 гг.* Вынікам вайны быў пераход часткі ўкраінскай тэрыторыі пад

уладу асманаў. Узмацненне асманскай небяспекі прывяло да збліжэння Рэчы Паспалітай са Свяшчэннай Рымскай Імперыяй і Расіяй.

У 1683 г. асманы ўварваліся ў Аўстрыю і аблажылі яе сталіцу Вену, паклаўшы пачатак чарговай вайне Асманскай імперыі супраць Рэчы Паспалітай *1683–1699 гг.* Дзякуючы эфектыўным дзеянням армій Польшчы і ВКЛ у бітве пад Венай турэцкая армія атрымала поўнае паражэнне. Гэтая перамога спыніла турэцкую экспансію ў Еўропе. У 1684 г. была створана антытурэцкая Свяшчэнная ліга ў складзе Аўстрыі, Рэчы Паспалітай і Венецыі. У 1686 г. да яе далучылася Расія. Аднак падтрымка асманаў Францыяй зацягнула баявыя дзеянні. У 1699 г. быў падпісаны *Карловіцкі мір*, паводле ўмоў якога Асманская імперыя траціла значную частку сваіх тэрыторый, Рэч Паспалітая вяртала страчанае ў 1674 г. украінскае Падолле.

Войны Рэчы Паспалітай з Асманскай імперыяй аказвалі значны ўплыў на міжнароднае становішча ў Еўропе на працягу ўсяго XVII ст. Нягледзячы на тое што яны не закранулі непасрэдна беларускія землі, іх уплыў у Беларусі адчуваўся. З аднаго боку, яны адцягвалі рэсурсы Рэчы Паспалітай, аслаблялі яе на іншых знешнепалітычных напрамках. З другога боку, асманскі фактар спрыяў збліжэнню Рэчы Паспалітай і Расіі ў апошняй трэціне XVII ст. і заключэнню Вечнага міру 1686 гг. паміж гэтымі дзяржавамі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

| Хоцінская бітва 1621 г. | Хоцінская бітва 1673 г. |
|---|---|
|  *Хоцінская бітва. 1867 г. Мастак Ю. Брант* |  *Ян Сабескі пад Хоцінам. 1697 г. Мастак А. Стэх* |
| **Дата бітвы** | |
| 2 верасня — 9 кастрычніка 1621 г. | 10–11 лістапада 1673 г. |
| **Удзельнікі** | |
| Войска Рэчы Паспалітай пад камандаваннем вялікага кароннага гетмана літоўскага Яна Караля Хадкевіча — войска Асманскай імперыі пад камандаваннем султана Асмана II | Войска Рэчы Паспалітай пад камандаваннем вялікага кароннага гетмана Яна Сабескага — войска Асманскай імперыі на чале з Гусейн-пашой |
| **Вынікі** | |
| Перамога Рэчы Паспалітай | Перамога Рэчы Паспалітай |
| **Наступствы** | |
| Асманская імперыя была вымушана спыніць вайну і часова адмовіцца ад планаў пашырэння сваіх межаў у Еўропе | Не прывяла да пералому ў вайне, але падняла прэстыж Рэчы Паспалітай у Еўропе |

1. *Укажыце храналагічныя рамкі войнаў, падчас якіх адбыліся дадзеныя бітвы.*
2. *Назавіце агульныя і адметныя рысы гэтых бітваў.*
3. *Гетман Ян Сабескі атрымаў мянушку «Хоцінскі леў». Як вы лічыце, ці паўплывала перамога ў бітве на яго абранне на польскі трон у 1674 г.?*
4. *На рахунку Яна Сабескага яшчэ адна перамога над туркамі. У лісце да Інакенція IX, што суправаджаў адасланы ў Ватыкан сцяг прарока Магамета, Ян III выказаўся коратка: «Мы прыйшлі, пабачылі, Бог перамог». Калі і дзе адбылася гэтая бітва?*